

Download



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

У судзе Першамайскага раёна г. Мінска 1 кастрычніка вынеслі прысуд Дмітрыю Сманцару, якога вінавацілі ў публічнай абразе прадстаўніка ўлады паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Згодна з абвінавачваннем, 30 красавіка 2021 года Дмітрый Сманцар пакінуў абразлівы каментар у телеграм-канале "Лухта" пад публікацыяй пра супрацоўніка міліцыі з Івацэвічаў **Руслана Куцко** наступнага зместу: *"Куцко - <нецэнзурнае слова>"*.

Нагадаем, **Руслан Куцко** быў прызнаны пацярпелым па крымінальнай справе супраць **Вольгі Кронда**, якая пакінула пад фотаздымкам міліцыянта эмодзі ў выглядзе “гаўняшкі”. У публікацыі, якую пракаментаваў абвінавачаны Дмітрый Сманцар, змяшчаўся фотаздыкам Куцко і спасылка на гісторыю Вольгі, а сам каментар Дзмітрыя паўтараў выказанае меркаванне Вольгай толькі ў выглядзе слова. Агулам пад пастом пра Руслана Куцко было размешчана больш за 400 каментароў.

Дзмітрый Сманцар прызнаў віну цалкам і адмовіўся да дачы паказанняў.

Пракурор **Мацвей Худаешка** прасіў суд прызнаць Дзмітрыя Сманцара вінаватым і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову тэрмінам на два гады.

Суддзя **Максім Трусевіч** пагадзіўся з меркаваннем пракурора і прызначыў Сманцару 2 года “хатняй хіміі”, абавязаў яго **сплаціць кампенсацыю** нанесенай маральнай шкоды пацярпеламу **ў памеры 1000 рублёў**, а мабільны тэлефон Дзмітрыя канфіскаваць у даход дзяржавы як сродак здзяйсненні злачынства.
t.me/viasna96/7427
5.4K viewsOct 1, 2021 at 11:01

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy